**Сакалоўская, І.** Назаўжды ў сэрцах / І. Сакалоўская // Витебские вести. — 2014. — 22 февр. — С. 11.

## НАЗАЎЖДЫ Ў СЭРЦАХ

Мерапрыемствы, прысвечаныя гадавіне вываду савецкіх войск з Афганістана, прайшлі на Браслаўшчыне.

У Ахрэмаўскай СШ напярэдадні важнай даты па ініцыятыве ветэранаў-«афганцаў» усталявалі мемарыяльную дошку ў гонар былога вучня, воіна **Валерыя Александровіча –** адзінага ўраджэнца з браслаўскага краю, які загінуў падчас выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. Ён праслужыў на афганскай зямлі не больш за два тыдні, аднак коштам свайго жыцця выратаваў таварышчаў. Пахаваны Валерый Александровіч на могілках у роднай вёсцы Мелеўцы.

Урачыстае адкрыццё памятнага знака прайшло 15 лютага, пасля чаго адбылося ўшанаванне браслаўчан, якія ўдзельнічалі ў афганскай вайне. На мерапрыемтсве прысутнічалі старшыні райвыканкама Сяргей Шматаў і Савета дэпутатаў Ніна Пучынская.

Сёлета дзесяцігадовы юбілей адзначае і Браслаўская раённая грамадская арганізацыя «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». Па словах яе старшыні Леаніда Мікшты, у суполку ўваходзяць 30 чалавек, яны актыўныя ўдзельнікі раённых мерапрыемтсваў і дзяржаўных свят, сваёй дзейнасцю спрыяюць патрыятычнаму выхаванню моладзі.

Урачыстая лінейка прайшла каля браслаўскай СШ № 1 імя А. Жданава, прысутныя наведалі нядаўна адчынены музей памяці воінаў-«афганцаў». Ідэю стварыць яго калісьці прапанаваў Леанід Мікшта, старшыню афганскай арганізацыі падтрымалі дырэктар Тамара Стома і калектыў установы. Экспазіцыя, прысвечаная падзеям вайны, увесь час папаўняецца. У зборы ваенных рэчаў, дакументаў і здымкаў дапамагаюць удовы і маці загінулых «афганцаў».

У Афганістане служылі 110 ураджэнцаў раёна, 29 браслаўчан узнагароджаны ордэнамі і медалямі за мужнасць і гераізм. Цяпер у рэгіёне пражываюць 79 воінаў-«афганцаў», 8 сведкаў той вайны не дажылі да юбілейнай даты.

**Ірына Сакалоўская**